Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44

DOI:10.17951/sb.2023.17.125-137
Studia Białorutenistyczne 17/2023 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Mikałaj Chaustowicz

University of Warsaw (Poland)
e-mail: m.khaustovich@uw.edu.pl
https://orcid.org/0000-0002-3007-0603

# Юльян Ляскоўскі як беларускамоўны літаратар

*Yulian Liaskoŭski as a Belarusian-language writer*

*Julian Laskowski jako pisarz białoruskojęzyczny*

**Abstract**

A distinctive feature of the Belarusian literary process of the 19th century is the parallel presence of authorial and anonymous works. In the corpus of artistic texts of this period there are more than a hundred anonymous works. We know the names and surnames of many writers who allegedly wrote in Belarusian, but to our time no Belarusian works have survived. The subject of this study is the life and creative vicissitudes of Yulian Liaskouski (1826–1889), as well as hypotheses regarding the possible involvement of the poet in the creation of the poem *Zahraj, zahraj, chłopcze mały... (Play, Play, Boy Small...)* and propaganda texts for the people from the early 1860s. The article, based on the analysis of printed and handwritten materials, proves that Yulian Liaskouski, who most often performed under the pseudonyms Y. Korabicz, Marcin Mizera, and Mroczek, used not only Polish, but also Belarusian in his works. It is very likely that the poems *Ziemielka maja… (My land…)* and *Pad dudu (Sing the Bagpipe Pad)*, published by him as folk ones in the article *Słówko o pieśni (A Word about Song)* (1882), belong to him. However, the most significant evidence in favour of the fact that Y. Liaskouski has written some works in Belarusian is the statement of Adam Honori Kirkor, in which a well-known Vilnius editor and publisher includes the poet and publicist Yulian Mroczek among the most famous Belarusian writers of the middle of the 19th century – Vincent Dunin-Marcinkewicz, Arciom Viaryha-Dareuski, Uladislau Syrakomlia, Vikentij K.

**Keywords**: Belarusian-language works, *Ziemielka maja…*, *Pad dudu*, mystification in literature, Adam Honory Kirkor, Yulian Mroczek

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



**Abstrakt**

Charakterystyczną cechą białoruskiego procesu literackiego XIX wieku jest paralelne występowanie dzieł autorskich oraz anonimowych. W korpusie tekstów artystycznych tego okresu znajduje się ponad sto anonimowych dzieł. Znamy wprawdzie imiona i nazwiska wielu pisarzy, którzy rzekomo pisali po białorusku, ale do naszych czasów nie zachowały się żadne białoruskie utwory. Przedmiotem niniejszego badania są perypetie życiowe i twórcze losy Juliana Laskowskiego (1826–1889), a także hipotezy dotyczące możliwego zaangażowania poety w powstanie wiersza *Zahraj, zahraj, chłopcze mały...* oraz tekstów propagandowych dla ludu z początku lat 60. XIX w. Artykuł, oparty na analizie materiałów drukowanych i rękopiśmiennych, dowodzi, że J. Laskowski, występujący najczęściej pod pseudonimami J. Korabicz, Marcin Mizera i Mroczek, w swojej twórczości posługiwał się nie tylko językiem polskim, ale także białoruskim. Jest wielce prawdopodobne, że wiersze *Ziemielka maja…* i *Pad dudu*, opublikowane przez niego jako ludowe w artykule *Słówko o pieśni* (1882), są jego autorstwa. Jednak najbardziej znaczącym dowodem tego, że J. Laskowski pisał po białorusku, jest wypowiedź Adama Honory Kirkora, w której znany wileński redaktor i wydawca włącza poetę i publicystę Juliana Mroczka do grona najsłynniejszych pisarzy białoruskich połowy XIX wieku – Wincenta Dunina-Marcinkiewicza, Arcioma Weryha-Darewskiego, Władysława Syrokomli, Wikiencija K.

**Słowa kluczowe**: utwory białoruskojęzyczne, *Ziemielka maja...*, *Pad dudu*, mistyfikacja w literaturze, Adam Honory Kirkor, Julian Mroczek

**Анатацыя**

Беларускі літаратурны працэс у XIX ст. адметны тым, што ў корпусе ягоных мастацкіх тэкстаў маецца больш за сто ананімных твораў. І гэта пры тым, што мы ведаем імёны і прозвішчы шматлікіх літаратараў таго часу, якія, па сведчанні сучаснікаў, пісалі па-беларуску, але анічога з іхняе беларускамоўнае спадчыны нібыта не захавалася. Прадметам дадзенага даследавання з’яўляюцца перыпетыі жыцця і творчага лёсу Юльяна Ляскоўскага (1826–1889), а таксама гіпотэзы адносна магчымай датычнасці паэта да напісання верша *Zahraj, zahraj, chłopcze mały...* і агітацыйных тэкстаў для люду на пачатку 1860-х гг. У артыкуле на падставе аналізу друкаваных і рукапісных матэрыялаў даводзіцца, што Ю. Ляскоўскі, які часцей за ўсё выступаў пад псеўданімамі J. Korabicz, Marcin Mizera, а таксама Mroczek, выкарыстоўваў у сваёй творчасці не толькі польскую мову, але і беларускую. Вельмі імаверна, што яму належаць вершы *Ziemielka maja…* і *Pad dudu*, апублікаваныя ім як народныя ў артыкуле *Słówko o pieśni* (1882). Аднак самым істотным сведчаннем на карысць таго, што Ю. Ляскоўскі пісаў па-беларуску, з’яўляецца сцверджанне Адама Ганоры Кіркора, у якім знаны віленскі рэдактар і выдавец далучае паэта і публіцыста Юльяна Мрочака да кагорты самых вядомых беларускамоўных літаратараў сярэдзіны XIX стагоддзя – Вінцэнта Дунін-Марцінкевіча, Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, Уладзіслава Сыракомлі, Вікенція К.

**Ключавыя словы**: беларускамоўныя творы, *Ziemielka maja…*, *Pad dudu*, даследніцкая містыфікацыя, Адам Ганоры Кіркор, Юльян Мрочак

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



Асобныя гісторыкі літаратуры пачатку XX стагоддзя на падставе пэўных звестак, крыніцу якіх не асабліва выяўлялі, сцвярджалі, што Юльян Ляскоўскі пісаў па-беларуску. Так, у 1913 г. Вацлаў Ластоўскі занатаваў пра яго:

> Аўтор зборніка вершоў *Białoruski Bandurzysta* (Wilno, 1861). Нам казалі бытцым *Białoruski Bandurzysta* сперша быў напісаны па беларуску, а ўжо пасьля пераложэн на польскую мову самім аўторам. З вершаў яго відаць, што ён быў гарачы беларускі патрыот. У адным з сваіх вершоў ён кажэ:
> Do nas więc, do nas, wielmożne pany!
> A z swojską mową, bo mowa wasza,
> Ten jej ton nigdy tam nie słyszany,
> Z mogił tych ojce nam powystrasza,
> I opuścieją nasze kurhany!
> … Słowa zmieniono w jakoweś grymasy,
> W jakieś pod nosem dziwne mamrotanie,
> Co, Boże odpuść! jak złego zesłanie,
> Jak wieżę Babel stawi was przy tłumie,
> Przy gminie naszym, zrodzonym w tej ziemi,
> Przy ludzie prostym, przed bracią młodszemi,
> Że człek człowieka zrozumieć nie umie…[1].
> На друкаваным экзэмпляру *Biał. Bandurzysty* напісана: „Majej žanie”, відаць рукою аўтора. Патрэбна яго біографія, партрэт і творы (Vlast, 1913, s. 2).

Крыніцу інфармацыі Власт не раскрывае, але, праўдападобна, ён выкарыстаў звесткі, атрыманыя ад Рамуальда Зямкевіча. Гэтак жа, як і Яўхім Карскі:

> Наконецъ, называютъ цѣлый рядъ бѣлорусскихъ писателей, о произведеніяхъ которыхъ имѣются только преданія или слухи. Такъ въ „Нашей Нівѣ” за 1913 г., №№ 37–38, въ статьѣ Власта *Памажыця!* Указаны еще слѣдующіе писатели (свѣденія о нихъ ниже дополняются Р. Земкевичемъ): <…> е) Юльянъ Ляскоўскі, авторъ сборника *Białoruski Bandurysta* (Wilno, 1861). Хотя эта книга вся на польскомъ языкѣ, но есть предположенія, что авторъ писалъ и по-бѣлорусски; между прочимъ онъ переводилъ баллады Мицкевича (Karskij, 1922, kn. III, cz. 3, s. 76).

1 Радкі з паэмы *W cudzéj* stronie падаюцца паводле першакрыніцы (Laskowski, 1861, s. 70, 34), бо ў „Нашай ніве” твор цытуецца са шматлікімі памылкамі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



Як бачна, даследнікі не падаюць, бо, відавочна, не маюць, аніякіх біяграфічных звестак пра паэта. Магчыма, пэўныя звесткі былі[2] ў Юзафа Галомбка, які сцвярджаў, што Юльян Ляскоўскі быў на эміграцыі ў Францыі:

> Za najlepszy z tego działu należy uznać zbiorek wierszy Juljana Laskowskiego p. t. *Białoruski bandurzysta*, w którym poeta zamieścił (str. 15–105) poemat liryczno-opowiadający p.t. *W cudzej stronie*. W utworze tym autor całym sercem i duszą pozostaje przy swej rodzinnej Białorusi, którą kocha gorąco i na wygnaniu we Francji tęskni do niej latami. To właśnie gorące uczucie dodaje utworowi niezmiernie dużo uroku (Gołąbek, 1932, s. 19).

Доўгі час ніхто з беларускіх даследнікаў не спраўджваў паведамленне Власта пра беларускамоўную творчасць Ю. Ляскоўскага. Прынамсі, у навуковых публікацыях пра гэта няма ані слова. І толькі ў 1970-я гг. Генадзь Кісялёў, каментуючы для зборніка *Пачынальнікі* ліст Аляксандра Рыпінскага да Адама Плуга і артыкул Аляксандра Ельскага *O gwarze białoruskiej*, выявіў шэраг цікавых звестак у даўніх бібліяграфічных даведніках. Найважнейшая з іх тая, што ў 1870–1880-я гг. Ю. Ляскоўскі карыстаўся псеўданімамі J. Korabicz і Marcin Mizera (Kìsâlëŭ, 1977, s. 180, 340). А гэта дало магчымасць гісторыку літаратуры палучыць паэта з апублікаванымі Сцяпанам Александровічам вершамі *Ziemielka maja*… і *Pad dudu* (Aleksandrovič, 1965, № 14, s. 3), а г. зн. пацвердзіць паведамленне Власта і дадаць яго да почту беларускамоўных літаратараў XIX стагоддзя (Ljaskoŭski, 1988, s. 309–310, 469).

Апрача таго, Г. Кісялёў, уважліва прачытаўшы зборнік *Białoruski Bandurzysta*, звярнуў увагу на подпісы пад вершамі і сцвердзіў, што Ю. Ляскоўскі пэўны час быў на эміграцыі (Лондан, Прусія, Аўстра-Венгрыя), але скарыстаўшыся царскаю амністыяй 1856 г., вярнуўся на Бацькаўшчыну. Пасля Паўстання 1863 г. ён жыў у Польшчы, займаўся журналістыкай, дапамагаў Конраду Прушынскаму выдаваць штотыднёвік „Gazeta Świąteczna” і рэдагаваў „Echo Łomżyńskie”.

На пачатку 1990-х гг. Г. Кісялёў выявіў дакументы, якія датычылі просьбы Ю. Ляскоўскага пра вяртанне на Бацькаўшчыну. У выніку сталі вядомыя год і месца нараджэння паэта, яго заняткі і служба ў Вільні, а таксама прычына, чаму ён 11 красавіка 1849 г. мусіў з’ехаць за мяжу (Kìsâlëŭ, 1994, s. 148–161).

Даследаванні Г. Кісялёва, а таксама пэўныя загадкі і таямніцы лёсу Ю. Ляскоўскага сталіся падставаю ўзнікнення ў сярэдзіне 1990-х гг. гіпотэзы пра датычнасць паэта да напісання славутага верша *Zahraj, zahraj, chłopcze mały...*, аўтарам якога доўгі час лічыўся Паўлюк Багрым.

У аснове гіпотэзы – дапушчэнне, што эмігрант Ю. Ляскоўскі пэўны час жыў у Лондане (там у 1855 г. была закончана ягоная паэма *W cudzéj stronie*),

[2] З подпісу пад паэмай *W cudzéj* stronie можна адно даведацца, што яна была закончаная ў 1855 г. у Лондане. У той жа час, у тэксце твора адсутнічаюць усялякія алюзіі пра побыт аўтара/лірычнага героя ў Францыі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



а г. зн. ён быў знаёмы з Аляксандрам Рыпінскім[3], а таксама Ігнацы Яцкоўскім. У выніку нібыта склаўся „своеасаблівы трыумвірат эмігрантаў-беларусаў", які „рэалізаваў містыфікацыю": І. Яцкоўскі падаў звесткі пра крашынскія падзеі 1828 г., Ю. Ляскоўскі напісаў верш *Zahraj, zahraj*… (ён жа, уласна, і эміграваў праз страх перад рэкрутчынай!), а А. Рыпінскі пераклаў верш на польскую мову.

Аніякіх дакументальных фактаў не падавалася. Замест іх выкарыстоўваліся дапушчэнні гісторыкаў літаратуры. Напрыклад, С. Александровіча: „Магчыма, гэта невядомыя творы Паўлюка Багрыма. У вершы *Пад дуду* адчуваецца пэўная пераклічка з вершам *Заграй, заграй, хлопча малы*…" (Aleksandrovič, 1965, № 14, s. 3) ці Г. Кісялёва: „У Лондане ён [Ю. Ляскоўскі. – *М. Х.*] павінен быў зблізіцца са сваім земляком Аляксандрам Рыпінскім <…>. У іх шмат агульнага – любоў да літаратуры, да паэзіі, замілаванне беларускім фальклорам, туга па Беларусі. Так што Рыпінскі, трэба думаць, ведаў Ляскоўскага не толькі па зборніку *Беларускі бандурыста*, але і асабіста. Пра іх магчымыя сувязі пісаў і Адам Мальдзіс у сваім *Англійскім дзённіку*" (Kìsâlëŭ, 1994, s. 154–155).

Гэта азначае: калі С. Аляксандровіч лічыў, што вершы *Ziemielka maja*… і *Pad dudu* належаць, як і верш *Заграй, заграй*…, П. Багрыму, а Г. Кісялёў дапускаў, што гэтыя творы з артыкула *Słówko o pieśni* (Korabicz, 1882, nr 287–288] напісаныя Ю. Ляскоўскім, бо „верш *Зямелька мая* можна разглядаць як узнаўленне сродкамі беларускай мовы і народнай паэтыкі першых радкоў паэмы *У чужой старане*" (Kìsâlëŭ, 1994, s. 158), дык можна сцвердзіць, што верш *Zahraj, zahraj*… таксама напісаў аўтар зборніка *Białoruski Bandurzysta*.

Як бачым, гіпотэза пабудаваная на падставе няпэўных аргументаў: „ланцужкі" паміж гісторыка-літаратурнымі фактамі надзвычай невыразныя, калі не сказаць – іх проста няма. Увогуле, на нашую думку, гіпотэза створаная шляхам падтасоўвання дапушчэнняў і памылковых сцвярджэнняў. А таму разбурыць дадзеную гіпотэзу можна з дапамогаю невялічкае абвесткі ў адной з эміграцыйных газет 1850-х гг.:

> P. Julian Laskowski, który w styczniu 1854 r. przeniosł się z Francyi do Anglii, proszony jest o zgłoszenie się do majora Karola Szulczewskiego, 10, Duke Street S.-James w Londynie, po list od familii dla niego nadesłany (*Doniesienia,* 1858, nr 12, s. 6).

У абвестцы, па-першае, ёсць пацвярджэнне інфармацыі Ю. Галобка пра побыт Ю. Ляскоўскага ў Францыі; па-другое, падаецца – трэба думаць – дакладная дата пераезду паэта ў Англію. Яе, відавочна, ведаў Караль Шульчэўскі (1813–1884), сакратар Літаратурнага таварыства сяброў Польшчы, бо эмігранты, прыехаўшы ў Англію, перш-наперш звярталіся да яго. Аднак у Лондане Ю. Ляскоўскі не

[3] А. Рыпінскі згадаў І. Ляскоўскага ў сваім лісце да Адама Плуга сярод 55 „польскіх пісьменнікаў, якія або нарадзіліся на Белай Русі, або таксама пісалі пра яе на абедзвюх мовах нашай правінцыі, як польскай, так і русінскай" (Kìsâlëŭ, 1977, s. 176).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



меў шансаў атрымаць дапамогу ад Таварыства, бо яно свае сродкі размяркоўвала толькі сярод былых удзельнікаў Лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг.

На падставе абвесткі ў газеце „Wiadomości Polskie" можна зрабіць выснову, што толькі ў студзені 1854 г. маглі сустрэцца ў Лондане І. Яцкоўскі, А. Рыпінскі і Ю. Ляскоўскі. А гэта азначае, што – нават калі і існаваў „трыумвірат эмігрантаў-беларусаў" – „рэалізаваць" містыфікацыю дзеля рамана І. Яцкоўскага *Powieść z mojego czasu* не ўяўлялася магчымым: у студзені 1854 г. кніга ўжо была ў друкарні А. Рыпінскага. Пра гэта сведчыць ліст І. Яцкоўскага ў Парыж Леанарду Нядзвецкаму ад 18 студзеня 1854 г.: „*Powieść z czasu mojego, czyli Przygody Litewskie* ўжо скончана і як толькі будзе вокладка, пашлю вам дзеля продажу, бо прэзентаў, панёсшы такія вялікія выдаткі, рабіць не магу" (BK, 2405, k. 456).

Звернем увагу: „кніга скончана" азначае заканчэнне друку тэксту рамана. Засталося толькі надрукаваць у іншай тыпаграфіі вокладку (А. Рыпінскі звыкла замаўляў іх у г. зв. літаграфіях). Пацвярджэнне даты выхаду ў свет кнігі І. Яцкоўскага знаходзім таксама ў карэспандэнцыі Ёахіма Лялевеля (1786–1861): у тым жа студзені 1854 г. славуты гісторык пісаў з Бруселя вядомаму арыенталісту Ігнацы Петрашэўскаму (1796–1869) у Берлін: „Ад Яцкоўскага атрымаў твой каталог. Быў ён, незвычайны гаварун, тут і сам; друкуе ўласным коштам свой двухтомны раман" (*Listy emigracyjne*…, 1954, s. 182).

Такім чынам, аніяк не мог удзельнічаць Ю. Ляскоўскі ў падрыхтоўцы рамана *Powieść z czasu mojego, czyli Przygody Litewskie*. А таму гіпотэза даследніка – гэта ці то ягоная ўласная свядомая містыфікацыя ў галіне атрыбуцыі верша *Zahraj, zahraj*…, ці то нядольнасць кампетэнтна правесці атрыбуцыйнае даследаванне.

Выяўленая абвестка можа быць сведчаннем некалькімесячнага побыту паэта ў Англіі, дзе Ю. Ляскоўскі пэўна ж разлічваў на паляпшэнне матэрыяльных умоваў жыцця, а таксама, магчыма, на ажыццяўленне сваіх літаратурных планаў, бо яшчэ ў Парыжы мог даведацца пра Польскую друкарню А. Рыпінскага. Напісаная (хутчэй – завершаная) у Лондане паэма *W cudzéj stronie*, пэўна ж, павінна была ўбачыць свет у сталіцы Англіі, але Ю. Ляскоўскі хіба не меў сродкаў, каб выдаць яе сваім коштам. А, як вядома, А. Рыпінскі друкаваў кнігі толькі коштам аўтараў.

Вядома, Ю. Ляскоўскі, добры знаўца беларускае мовы, мог у эміграцыі пісаць не толькі па-польску, але і па-беларуску. Аднак на падставе абвесткі ў газеце „Wiadomości Polskie" ад 20 сакавіка 1858 г. упэўнена можна сцвердзіць, што ён не меў дачынення да ўзнікнення верша *Zahraj, zahraj, chłopcze mały*….

Праўда, першыя звесткі пра тое, што Ю. Ляскоўскі пісаў па-беларуску, паходзяць усё ж не з XX стагоддзя, а з пачатку 1880-х гг. ад людзей, якія непасрэдна ведалі літаратара. У першую чаргу мы маем на ўвазе Адама Кіркора, які ў 1882 г. у трэцім томе *Живописной России* згадвае пра свайго знаёмца з віленскіх часоў як аднаго з тых, хто спрычыніўся дзеля развіцця беларускае літаратуры. Заўважым, «изъ современныхъ бѣлорускихъ поэтовъ» вядомы

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



віленскі рэдактар і выдавец называе літаральна некалькі чалавек[4]: перш-наперш Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і Арцёма Вярыгу-Дарэўскага, якія – паводле яго слоў – «пользуются большою популярностью», а таксама польскамоўнага паэта Уладзіслава Сыракомлю, які

> не только отлично зналъ языкъ бѣлорусскій, но зналъ народъ, любилъ его, понималъ его нужды, его желанія, проникалъ всю глубину его чувства, зналъ его преданія, поговорки. Поэтому неудивительно, что что его бѣлорусскіе пѣсни особенно любимы народомъ. Ихъ поютъ вездѣ, хотя немногіе знаютъ, кто былъ ихъ авторомъ (Kirkor, 1993, s. 327).

А пасля падае псеўданім і крыптанім яшчэ двух літаратараў: «Писали еще по-бѣлорусски въ новѣйшее время Іуліанъ Мрочекъ[5], Викентій К. и др.» (Kirkor, 1993, s. 327).

Дзіўна, што такі абазнаны чалавек, як А. Кіркор, што значную частку свайго жыцця правёў на роднай Літве і пэўны час фактычна стаяў на чале літаратурнага працэсу ў краі, змог назваць адно пяць (!) беларускамоўных паэтаў другое паловы XIX стагоддзя. Ды і тое – двух апошніх падаць толькі ў „закадаваным" выглядзе. «Викентій К.» – гэта, відаць, Вінцэсь Каратынскі[6]. Характэрна, пішучы пра польскамоўны даробак „барадатага ліцвіна", А. Кіркор наўпрост называе ягонае прозвішча (Kirkor, 1993, s. 328). Дык тут адно з двух: ці то яму не хацелася даваць царызму падставы для пераследу варшаўскага рэдактара, ці то лічыў непатрэбным дадаваць у польскамоўны даробак В. Каратынскага беларускамоўную „лыжку дзёгцю" (інакш кажучы – правінцыйны сепаратызм).

Зрэшты, больш імаверна, што А. Кіркор не можа назваць дакладна гэтых двух беларускамоўных паэтаў, які жылі на тэрыторыі Расейскае імперыі, па той прычыне, што іхнія тэксты насілі антыцарскі (антырасейскі) характар. Магчыма, А.Г. Кіркор ведаў гэтыя тэксты.

Хто ж такі «Іуліанъ Мрочекъ»?

Адказ знаходзім у лістах Юльяна Ляскоўскага да Юзафа Ігнацы Крашэўскага ад 7 снежня 1879 г. і 6 сакавіка 1880 г. Яны сведчаць, што „Mroczek" – псеўданім

[4] Вельмі высока А. Кіркор ацэньваў талент «совѣтника въ Могилевѣ, а потомъ вице-губернатора въ Витебскѣ» Манькоўскага, які «владелъ языкомъ, какъ немногіе. Его юморъ, умѣнье передавать народныя сцены знаменуютъ геніальныя способности» (Kirkor, 1993, s. 326). Праўда, на яго думку аўтар *Энеіды навыварат* жыў у канцы XVIII – першай палове XIX ст.

[5] Польскія слоўнікі псеўданімаў ведаюць толькі двух „Mroczków" – *J. Mroczka*, якім часам падпісваўся Ян Людвік Паплаўскі (Jan Ludwik Popławski, 1854–1908), ідэолаг „эндэкаў" („Narodowej Demokracji") і публіцыст, ды *Jana Mroczka*, які зрэдчас выкарыстоўваў Алексы Ржавускі (Aleksy Rżewuski, 1885–1939), дзеяч Польскай сацыялістычнай партыі і публіцыст (гл.: *Słownik pseudonimów*…, 1995, t. II, s. 660).

[6] Як варыянт – Вікенці Кастусь Каліноўскі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



Беларускага Бандурысты. Напачатку ён піша пра сваю „палітычную" кніжачку, якую хоча надрукаваць за мяжою:

> Idąc za tą wskazówką musiałem zrobić zarządzenie, aby do aprobaty WPana została przesłana broszura moja z Krakowa. Dotyczy ona chwili obecnej położenia naszego. Idzie o to, czy wyjścia z tego położenia mamy wyczekiwać znowu od losu i wypadków, czyli też do zmiany sami rękę przyłożyć winniśmy, w jakiej mierze i z jakim prawdopodobnie skutkiem? Broszura napisana rok temu, w późniejszym zaś czasie dodałem do niej jeden ustęp tylko, dotyczący znanej (z września r. b.) wizyty ks. B… w Wiedniu. Być może, że w obecnym czasie coś ująć, albo dodać wypadnie – przy swojem upierać się nie myślę; rozumiem przecież, że gdy mówią o nas… zatem i my coś więcej zasadniczego powiedzieć winniśmy, niż to, co dorywczo tylko wygłaszamy w dziennikach. Broszurę prześle do Drezna p. Apollin Hofmeister z Krakowa, blizki znajomy i dawny sąsiad brata WPana. Czy ma ma (sic!) być drukowana, cała lub w części, albo za niewłaściwą na czas obecny poczytana zostanie, niech mi będzie wolno to całkowicie uznaniu WPana zostawić. W każdym razie pragnąłbym następnie o losie jej coś wiedzieć, czego mi Szanowny Pan może nie odmówisz, gdy tę robotę moją raczysz przejrzeć i należycie ocenić (BJ, rkps 6514/IV, k. 235r).

Пазней Ляскоўскі падае тытул кніжачкі і псеўданім, пад якім хоча яе выдаць:

> Tu mam tyle teraz wolnego czasu – jak zwykle na bezchlebiu i między obcymi zupełnie ludźmi, że mogę przejrzeć raz jeszcze, zastanowić się i na zimno rozważyć błędy mojej broszury: *Polska i Rossya w obec idei słowiańskiej, przez Mroczka*[7], którą to broszurę w rękopiśmie do W. Pana przesłał z Krakowa powinowaty mój p. Apollin Hofmeister. <…> Przepraszam WPana, że śmiałem tyle Mu z tą broszurą zadać fatygi. Jeżeli wolno, prosiłbym o parę słów informacyi, czy broszurę tę (rozumie się już przerobioną) uznajesz WPan za właściwe puścić w obecnym czasie? Dużo jest teraz w tej samej kwestyi gawędy, ale zasadniczo jeszcze jej nie postawiono. Ja zamierzam znacznie rozwlekłość jej skrócić i prawdopodobnie wyjdzie 1/3 część tylko (BJ, rkps 6514/IV, k. 236r – 236v).

Кніжачка Мрочка-Ляскоўскага, як вядома, свету не ўбачыла. Але пра рукапіс на палітычную тэму ведалі, відаць, знаёмыя паэта і публіцыста, які з сярэдзіны 1860-х гг. жыў у павятовым гарадку Млава, адкуль напрыканцы 1879 г. з невядомых прычынаў мусіў уцякаць праз Кракаў у Львоў.

Дапускаем, што якраз у 1879–1880 гг. Ю. Ляскоўскі сустракаўся ў Кракаве з А. Кіркорам. Пра гэта сведчыць выяўленая Г. Кісялёвым „кароткая запіска" без даты і месца, у якой Ю. Ляскоўскі, „спасылаючыся на даўняе віленскае знаёмства, просіць Кіркора аб спатканні дзе-небудзь у горадзе, бо сам з-за хворых ног не можа падняцца да адрасата на высокі паверх" (Кісялёў, 1994, s. 161).

7 Літаральна: кажан (лац. Vespertilio, ад vespertinus – вечаровы). У польскай мове, апрача слова „mroczek", ужываецца (часцей) „nietoperz".

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



Цыдулка Беларускага Бандурысты да А. Кіркора, пра якую згадаў Г. Кісялёў, сведчыць, што іхняе знаёмства, якое завязалася на пачатку 1860-х гг. у Вільні, мела свой працяг у 1879–1880 гг. у Кракаве. „Вядома ж, землякі – руплiўцы беларускай культуры – знайшлі аб чым пагаварыць” [Кісялёў, 1994, s. 161], – па-мастацку вобразна завяршае ў 1994 г. артыкул *Дзве „палавінкі” аднаго жыцця…* Г. Кісялёў. І, відавочна, не быў далёкі ад праўды: прынамсі, пра свае планы надрукаваць палітычную кніжачку Ю. Ляскоўскі паведаміў пры сустрэчы. Істотна, што А. Кіркор памятаў пра суайчынніка і ягоны псеўданім, калі пісаў раздзел *Умственныя силы и средства образованія* для шматтомнага выдання Маўрыцыя Вольфа *Живописная Россия*[8]. Але сама важнае тое, што Юльяна Мрочка ён далучыў не да шматлікага шэрагу «бѣлорусскихъ уроженцевъ, писавшихъ по-польски», (што адпавядала, улічваючы колькасць напісанага, праўдзе), а менавіта да пяціасабовага „гуртка” беларускамоўных паэтаў. Трэба думаць, А. Кіркор не меў падставаў фальсіфікаваць ці містыфікаваць літаратурны працэс сярэдзіны XIX ст. на яго любімай Літве; тым больш, што з Ю. Ляскоўскім ён сустрэўся праз шмат (амаль дваццаць) гадоў, пасля таго, як бачыўся з іншымі прадстаўнікамі „беларускага гуртка”: У. Сыракомля памёр у 1862 г., В. Дунін-Марцінкевіч і А. Вярыга-Дарэўскі дажывалі свой век (першы – у Люцінцы пад Мінскам, другі – у Іркуцку на высылцы), а В. Каратынскі цяжка працаваў у Варшаве. Дапускаем, што прыезд Ю. Ляскоўскага ў Кракаў стаўся тым „свежым аргументам”, які актуалізаваў памяць А. Кіркора датычна беларускамоўнае творчасці Ю. Ляскоўскага[9]. Чаму аўтар *Живописной России* выкарыстоўвае менавіта гэты псеўданім млаўскага карэспандэнта варшаўскіх выданняў? Ды з тае прычыны, што „Мрочак” быў найбольш закадаваны. Прынамсі, жыхара Ломжынскае губерні „J. Korabicza” “вылічыць” было нескладана, а таямніца „Мрочка” была вядомая адно невялікаму колу знаёмых Ю. Ляскоўскага. Тых, з кім ён раіўся наконт друку кніжачкі *Polska i Rossya wobec idei słowiańskiej.* Дык варта задумацца: а ці не прыехаў Ю. Ляскоўскі ў 1860 г. на Бацькаўшчыну, маючы пры сабе не толькі польскамоўныя творы, якія склаліся на томік *Białoruski bandurzysta*, але і беларускамоўныя? Толькі вось якія? Можа, мы ведаем іх сёння як ананімныя? Ці ўсё ж яны беззваротна страчаны?

---

8 Як нарадзілася і ажыццяўлялася ідэя праекту М. Вольфа *Живописная Россія* расказаў ў 1883 г., адразу пасля выхаду ў свет ейнага трэцяга тома і смерці аўтара праекту, Зыгмунт Лібровіч, неадменны сакратар выдання, у кніжцы S*tara Polska w opisie malowniczym: Historja niewydanego dzieła według nieogłoszonych dotąd listów i dokumentów Mich. Grabowskiego, Kaczkowskiego, Kirkora, Kondratowicza, Kraszewskiego, księgarza Mauryc. Wolffa i wielu innych* (Petersburg 1883). Заўважым: выхад у свет і III тома *Живописной Россіи*, і кніжкі З. Лібровіча выклікаў істэрычную рэакцыю „заходнерусаў” і Міхайлы Каяловіча.

9 Характэрна, што ў 1874 г. А. Кіркор беларускімі літаратарамі назваў адно В. Дуніна-Марцінкевіча і А. Вярыгу-Дарэўскага і не згадаў ні пра У. Сыракомлю, ні пра Юльяна Мрочка, ні пра Вікенція К. (Kirkor, 1874, s. 53–54).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



Прыўзняўшы крыху покрыва з кісялёўскага рэбуса („Мрочак наогул таямнічае для нас імя”), мы апынуліся перад няменш складанаю задачаю: за якія такія заслугі А. Кіркор паставіў Ю. Ляскоўскага поруч са знанымі беларускамоўнымі паэтамі Літвы і Беларусі? Няўжо ў вачах А. Кіркора ягоны паэтычны даробак быў параўнальны па колькасці ці мастацкіх вартасцях з вышэйзгаданымі літаратарамі?

На інфармацыю А. Кіркора пра Юльяна Мрочка звярнуў увагу на пачатку XX ст. толькі Максім Багдановіч. Ён уключыў гэтае імя ў пералік паэтаў, якія «почти не печатались, хотя и писали на белорусском языке <…> Ялеги Франциш Вуль, Н. Короткевич, Юлиан Лясковский, Якуб Т-ки, Юлиан Мрочек и мн. др.» (Bahdanovič, 1993, t. III, s. 270) у сваім артыкуле *Белорусское возрождение*, што ўпершыню быў апублікаваны ў выдаваным ў Маскве часопісе «Украинская жизнь» (1915, № 1 і 2). У 1916 г., папраўлены і нязначна дапоўнены, ён быў надрукаваны як асобная кніжачка.

Цікава: Ю. Ляскоўскі і Юльян Мрочак, хоць і „ўзятыя” з розных крыніцаў, апынуліся ў М. Багдановіча поруч. А гэта заўсёды рабіла клопату каментатарам спадчыны паэта. У поўным зборы твораў паэта дадзенае выказванне пракаментавана наступным чынам:

> З названых паэтаў толькі Ю. Ляскоўскі з’яўляецца аўтарам зборніка *Беларускі бандурыст* (Вільна 1861). Пра творы Ю. Мрочака (sic!) звестак няма. З вершаў Ф. Вуля, М. Караткевіча, Якуба Т–кі вядома тое, што было запісана імі ў „Альбом” Вярыгі-Дарэўскага (*Дудару Арцёму ад наддзвінскага мужыка*[10], *Беларускія дудары…*[11], *Слоўна з неба Божы дар…*) (Zabrodskaja, Mazanik, Pilipovič, 1993, t. II, s. 542).

Псеўданім Ю. Ляскоўскага «Іуліанъ Мрочекъ», пададзены А. Кіркорам у *Живописной России*, быў успрыняты М. Багдановічам, а таксама пазнейшымі каментатарамі ягонае творчасці і даследнікамі як імя і прозвішча рэальнага чалавека. З гэтае прычыны ў энцыклапедыі *Максім Багдановіч* з’явіўся асобны слоўнікавы артыкул:

> МРО́ЧАК Юльян (? – ?), беларускі паэт. Пра жыццё і творы звестак няма. Толькі з арт. Б. *Белорусское возрождение* (1914) вядома: <…> На думку Б., творчасць М., як і іншых бел. пісьменнікаў 2-й пал. XIX ст., унесла значны ўклад у станаўленне і развіццё нац. л–ры і мовы (Моўčan, 2011, s. 351).

Сёння, аднак, трэба пагадзіцца з тым, што А. Кіркор пад псеўданімам «Іуліанъ Мрочекъ» меў на ўвазе Юльяна Ляскоўскага. Істотна таксама тое, што віленскі рэдактар добра ведаў паэта: сустракаўся з ім у 1860–1861 гг. (падчас падрыхтоўкі

[10] Верш Ялегі Пранціша Вуля мае тытул *К дудару Арцёму ад наддзвінскага мужыка*.
[11] Першы радок верша Мікалая Караткевіча гучыць так: *Бялорускі Дудару*….

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



да друку зборніка *Białoruski bandurzysta*) і ў 1879–1880 гг. Усё гэта дае падставы сцвярджаць: у даробку Ю. Ляскоўскага былі беларускамоўныя творы.

## REFERENCES

Aleksandrovič, Scjapan. (1965). Dva nevjadomyja veršy. *Litaratura i Mastactva*, 14, s. 4. [Александровіч, Сцяпан. (1965). Два невядомыя вершы. *Літаратура і Мастацтва*, 14, с. 4].

Bahdanovič, Maksim. (1993). *Belorusskoe vozroždenue.* U: Maksim Bahdanovič. *Ройny zbor tvoraй u trox tamax*. T. II: *Mastackaja proza, peraklady, litaraturnyja artykuly, rècènzii i natatki, čarnavyja nakidy* (s. 257–285). Minsk: Navuka i texnika. [Багдановіч, Максім. (1993). *Белорусское возрождение*. У: Максім Багдановіч. *Поўны збор твораў у трох тамах*. Т. II: *Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды* (с. 257–285). Мінск: Навука і тэхніка].

BJ – Biblioteka Uniwersytetu Jagiellońskiego w Krakowie, rkps 6514/IV: *Korespondencja J.I. Kraszewskiego*, seria III: *Listy z lat 1863–1887*, t. 54, *L (Labarry – Lemonier)*, k. 235, *J. Laskowski do J. I. Kraszewskiego*, list z 7.12.1879.

BJ, rkps 6514/IV: *Korespondencja J.I. Kraszewskiego*, seria III: *Listy z lat 1863–1887*, t. 54, *L (Labarry – Lemonier)*, k. 236–236v, *J. Laskowski do J. I. Kraszewskiego*, list z 06.03.1880.

BK – Biblioteka Kórnicka, rkps. 2405: *List Ignacy Jackowskiego do Leonarda Niedźwiedzkiego z 18.01.1854*.

Doniesienia. (1858). *Wiadomości Polskie,* nr 12 (20 marca).

Gołąbek Józef. (1932). *Wincenty Dunin-Marcinkiewicz, poeta polsko-białoruski*. Wilno.

Karskij, Efimij. (1922). *Bělorusy*. T. III: *Očerki slovesnosti bělorusskago plemeni*. Kn. 3: *Hudožestvennaâ literatura na narodnom" âzykě*. Petrograd. [Карскій, Ефимій. (1922). *Бѣлорусы*. Т. III: *Очерки словесности бѣлорусскаго племени*. Кн. 3: *Художественная литература на народномъ языкѣ*. Петроградъ].

Kirkor, Adam. (1874). *O literaturze pobratymczych narodów słowiańskich: Odczyty publiczne w muzeum techniczno-przemysłowym w Krakowie*. Kraków.

Kirkor, Adam. (1993). *Bělorusskoe Polěs'e: Umstvennyâ sily i sredstva obrazovaniâ*. U: *Živopisnaâ Rossiâ: Otečestvo naše v ego zemel'nom, istoričeskom, plemennom, èkonomičeskom i bytovom značenii: Litovskoe i Belorusskoe Poles'e* (s. 317–328). Minsk: Belorusskaâ ènciklopediâ. [Киркоръ Адамъ. (1993). *Бѣлорусское Полѣсье: Умственныя силы и средства образованія*. У: *Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье* (с. 317–328). Минск: Белорусская энциклопедия].

Kìsâlëŭ, Genadz′ (ukl.). (1977). *Pačynal'nìkì: Zgìstoryka-lìtaraturnyh matèryâlaй XIX st*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka [Кісялёў, Генадзь (укл.). (1977). *Пачынальнікі: З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст*. Мінск: Беларуская навука].

Kisjalëŭ, Henadz′. (1994). Dzve „palavinki” adnaho žуccja: Ljaskoŭski – Karabič. U: Kisjalëŭ Henadz′. *Radavodnae drèva: Kalinoŭski – èroxa – nastupniki* (s. 148–161). Minsk:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



Mastackaja litaratura. [Кісялёў, Генадзь. (1994). Дзве “палавінкі” аднаго жыцця: Ляскоўскі – Карабіч. У: Кісялёў Генадзь. *Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – наступнікі* (с. 148–161). Мінск: Мастацкая літаратура].

Korabicz J. (1882). *Słówko o pieśni*. *Nowiny*, nr 287 (17.10), s. 1; nr 288 (18.10), s. 1.

Laskowski Juljan. (1861). *Białoruski Bandurzysta: zbiorek wędrowny wierszem*, nakład autora; w drukarni A.H. Kirkora. Wilno.

Ljaskoŭski, Jul′jan. (1988). Pad dudu; Zjamel′ka maja… U: *Belaruskaja litaratura XIX stahoddzja: Xrèstamatyja: Vučèb. dapamožnik dlja studèntaŭ filal. spec. VNU*, sklad. i aŭt. kament A. Lojka, V. Rahojša, 2-e vyd., peraprac. i dap. (s. 309–310). Minsk: Vyšèjšaja škola. [Ляскоўскі, Юльян. (1988). Пад дуду; Зямелька мая… У: *Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя*: *Вучэб. дапаможнік для студэнтаў філал. спец. ВНУ*, склад. і аўт. камент А. Лойка, В. Рагойша, 2-е выд., перапрац. і дап. (с. 309–310). Мінск: Вышэйшая школа].

*Listy emigracyjne Joachima Lelewela*. (1954). Wydała i wstępem poprzedziła H. Więckowska. T. IV: *1849–1861*. Wrocław–Kraków: Zakład im. Ossolińskich.

Moŭčan, S. (2011). Mročak Jul′jan. U: *Maksim Bahdanovič: Èncyklapedyja*. Sklad. Ivan Salamevič, Mikalaj Trus (s. 351). Minsk: Belaruskaja èncyklapedyja. [Моўчан, С. (2011). Мрочак Юльян. У: *Максім Багдановіч: Энцыклапедыя*. Склад. Іван Саламевіч, Мікалай Трус (с. 351). Мінск: Беларуская энцыклапедыя].

*Słownik pseudonimów pisarzy polskich: XV w. – 1970 r*. (1994–1996), t. I–IV. Wrocław–Warszawa–Kraków: Zakład narodowy im. Ossolińskich.

Vlast. (1913). Pamažycja! *Naša Niva*, 37 (12.09), s. 2–3. [Власт. (1913). *Памажыцяǃ* *Наша Ніва,* 37 (12.09), с. 2–3].

Zabrodskaja, S.; Mazanik, L.; Pilipovič, K. (1993). Kamentaryi. U: Maksim Bahdanovič. *Pоŭny zbor tvoraŭ u trox tamax*. T. II: *Mastackaja proza, peraklady, litaraturnyja artykuly, rècènzii i natatki, čarnavyja nakidy* (s. 481–576). Minsk: Navuka i tèxnika. [Забродская, С.; Мазанік, Л.; Піліповіч, К. (1993). Каментарыі. У: Багдановіч Максім. *Поўны збор твораў у трох тамах.* Т. II: *Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды* (с. 481–576). Мінск: Навука і тэхніка].

SUBMITTED: 7.07.2023
ACCEPTED: 29.11.2023
PUBLISHED ONLINE: 1.02.2024

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Mikałaj Chaustowicz / Мікола Хаўстовіч** – Polska, Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki; dr hab., prof.; *specjalność*: literaturoznawstwo białoruskie; *zainteresowania naukowe*: literatura białoruska w XIX wieku.

*Adres*: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, ul. Dobra 55, 00-312, Warszawa, Polska

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:33:44



*Wybrane publikacje*:

1. Хаўстовіч, Мікола. (2001). *Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст*. Мінск: БДУ.
2. Хаўстовіч, Мікола. (2003). *Мастацкі метад Яна Баршчэўскага*. Мінск: БДУ.
3. Хаўстовіч, Мікола. (2006). *Айчына здалёку і зблізку: Ігнацы Яцкоўскі і Аляксандар Рыпінскі*. Мінск: Права і эканоміка.
4. Хаўстовіч, Мікола. (2010). *Шляхамі да беларускасці: Нарысы, артыкулы, эсэ*. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego.
5. Хаўстовіч, Мікола. (2014–2023). *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзяў*. T. I–IX. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego.